# УРОК 1

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ

**Мэта:** мяркуецца, што напрыканцы ўрока вучні

**будуць ведаць:** умовы актывізацыі літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва ў 1920-я гг.; становішча, у якім апынуліся беларускія пісьменнікі ў 1930-я гг.; тэматычнае і жанравае развіццё заходнебеларускай літаратуры; умовы стварэння і прычыны ліквідацыі літаратурных аб'яднанняў: «Маладняк», «Узвышша», «Полымя»; прадстаўнікоў літаратурных аб'яднанняў, іх творчыя здабыткі;

**авалодаюць паняццямі:** літаратурны працэс, рэалізм, мадэрнізм і яго плыні;

**удасканаляць навыкі:** складання тэзіснага плана лекцыі настаўніка, канспектавання літаратурна-крытычнага артыкула.

**Задачы выхавання і развіцця асобы вучняў:** стварыць умовы для развіцця аналітычнага мыслення вучняў, навыкаў слухання і канспектавання; садзейнічаць выхаванню маўленчай культуры вучняў, пашырэнню іх інтэлектуальнай прасторы.

**Абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя з ілюстрацыямі карціны М. Шагала «Мір хацінам, вайна палацам», малюнкаў Я. Драздовіча да часопіса «Рунь», плакат А. Лісіцкага «Клінам чырвоным бі белых».

**Тып урока:** актыўная лекцыя.

## Ход урока

### I. Арганізацыйны момант

### II. Актуалізацыя суб'ектнага вопыту

На пачатку першага ўрока ў 10 класе варта ўзгадаць асаблівасці літаратурна-грамадскага руху ў Беларусі ў пачатку XX ст. Менавіта на гэтым этапе скончылася вывучэнне курса беларускай літаратуры ў 9 класе.

Паўтарэнне пройдзенага матэрыялу праводзіцца ў чатырох групах.

**Заданне:** па прапанаваным ланцужку паняццяў успомніць і скласці паведамленне на тэму «Асаблівасці літаратурна-грамадскага руху ў Беларусі ў пачатку XX ст.».

**Група 1:** Першая руская рэвалюцыя (1905—1907 гг.) — нацыянальна-вызваленчы рух — Беларуская рэвалюцыйная грамада (1903 г., Пецярбург) — Беларуская сацыялістычная грамада (1905 г.).

**Група 2:** газета «Северо-Западный край» (г. Мінск) — «Наша доля» (1906 г., Вільня) — «Наша ніва» (1906—1915 гг., Вільня).

**Група 3:** «Загляне сонца і ў наша ваконца» (1905 г., Пецярбург) — «Наша хатка» (Вільня) — «Мінчук» (Мінск).

**Група 4:** Цётка (Алаіза Пашкевіч) — Ядвігін Ш. — Янка Купала — Якуб Колас — Максім Багдановіч — Алесь Гарун.

Вучні павінны прыйсці да высновы, што пачатак XX ст. быў плённым этапам у развіцці нацыянальнай культуры, які ўвайшоў у гісторыю культуры Беларусі пад назвай «нацыянальнае адраджэнне». Вялікую ролю адыграла газета «Наша ніва», на старонках якой пачыналі друкаваць свае творы будучыя класікі беларускай літаратуры (яны сябе так і называлі — «нашаніўцы»).

### III. Мэтавызначэнне

Настаўнік прапаноўвае разгледзець на прэзентацыі карціну М. Шагала «Мір хацінам, вайна палацам», плакат А. Лісіцкага «Клінам чырвоным бі белых» і прааналізаваць вобразы, сюжэты, а таксама час, адлюстраваны на іх.

Далей настаўнік агучвае тэму ўрока, арганізуе мэтавызначэнне, называе крытэрыі ацэнкі вучэбных дасягненняў вучняў (крытэрыі можна раздрукаваць для кожнага вучня):

- скласці тэзісны план па тэме «Умовы актывізацыі літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва ў 1920-я гг.»;
- даць характарыстыку становішча, у якім апынуліся беларускія пісьменнікі ў 1930-я гг.;
- падрыхтаваць паведамленне на тэму «Тэматычная і жанравая разнастайнасць літаратуры Заходняй Беларусі»;
- запоўніць табліцу «Літаратурныя аб'яднанні: гісторыя стварэння, рысы і адметнасці». Зрабіць вывад аб іх ролі ў гісторыі айчыннага пісьменства;
- ведаць азначэнне паняццяў: літаратурны працэс, рэалізм, мадэрнізм і яго плыні.

### IV. Арганізацыя працэсу навучання і кантролю ўзроўню засваення ведаў па тэме ўрока

**Заданне 1.** На аснове лекцыі настаўніка па тэме «Умовы актывізацыі літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва ў 1920-я гг.» скласці тэзісны план.

**Прыкладны змест лекцыі настаўніка**

**Грамадска-палітычнае жыццё.** У 20-я гг. XX ст. адбылося шмат гістарычных падзей, якія па-свойму паўплывалі на грамадска-палітычнае жыццё маладой Беларусі. Фарміраванне беларускай



Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

дзяржаўнасці адбывалася ў цяжкіх умовах. Беларуская палітычная дзейнасць шырока разгарнулася з сакавіка 1917 г. Вынікам яе стала ўтварэнне 25 сакавіка 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Неўзабаве 1 студзеня 1919 г. у Смаленску было абвешчана аб стварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі — БССР. Працягвалася Першая сусветная вайна, заходняя частка Беларусі была акупавана нямецкімі войскамі, унутры Савецкай Расіі пачалася грамадзянская вайна. У выніку Рыжскага дагавору, падпісанага 18 сакавіка 1921 г., тэрыторыя Беларусі аказалася падзеленай на тры часткі: яе заходняя частка ўвайшла ў склад Польшчы, усходняя — у склад РСФСР, і толькі 6 паветаў Цэнтральнай Беларусі склала тэрыторыю БССР. Час, калі адбываліся згаданыя падзеі, быў вельмі неспрыяльны для развіцця літаратуры. Многія пісьменнікі знаходзіліся на фронце або па-за межамі Беларусі. З 1915 па 1918 гг. Я. Купала не пісаў вершаў і мала друкаваўся. Я. Колас у гэты перыяд працаваў над паэмамі «Новая зямля» і «Сымон-музыка», але ў друку яго імя з'яўлялялася рэдка. Газет і часопісаў засталося мала, і тыя выходзілі ў свет нерэгулярна.

**Тэзіс 1** (прыклад). Развіццё беларускай літаратуры ў многім перапыніла Першая сусветная вайна, дзве рэвалюцыі 1917 г., акупацыі на тэрыторыі Беларусі — нямецкая, польская.

**Сацыяльна-культурнае развіццё.** З пачатку 20-х гг. XX ст. пачынаюцца закладвацца асновы савецкай нацыянальнай палітыкі ў Беларусі, якая ў гісторыі атрымала назву палітыкі беларусізацыі (увядзення беларускай мовы ва ўсе сферы жыцця), ідэолагам якой быў У. Ігнатоўскі. Па яго ініцыятыве быў арганізаваны ў 1922 г. Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Шмат увагі надавалася ліквідацыі бязграматнасці. Да сярэдзіны 1920-х гг. была створана сістэма народнай адукацыі. Падрыхтоўка спецыялістаў ажыццяўлялася ў вышэйшых навучальных установах. У 1919 г. узнавіў сваю работу Горы-Горыцкі земляробчы інстытут, у снежні 1920 г. у Мінску створаны Беларускі політэхнічны інстытут, у 1922 г. на яго базе адкрыты Інстытут сельскай і лясной гаспадаркі. У 1921 г. адкрываецца Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, у 1925 г. у Горках была створана Беларуская дзяржаўная акадэмія сельскай гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, а ў 1924 г. — Віцебскі ветэрынарны інстытут. Да пачатку 1930-х гг. працавала 31 ВНУ.

У 1920 г. было створана выдавецтва «Беларусь». З'явілася магчымаць выдання кніг на беларускай мове і мовах іншых народаў. Да сярэдзіны 1922 г. на тэрыторыі Беларусі было выдадзена 150 тысяч беларускіх кніг.

Важную ролю ў станаўленні беларускага тэатральнага мастацтва адыграў Першы беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-1, зараз Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы), адкрыты ў верасні 1920 г., рэжысёрам якога быў Я. Міровіч. Адначасова ў Мінску працавала Тэатральная трупа У. Галубка. У 1926 г. у Віцебску пачаў работу Другі беларускі дзяржаўны тэатр (БДТ-2, зараз Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Коласа).

1920-я гг. — час станаўлення беларускага кіно. Першымі нацыянальнымі мастацкімі фільмамі былі «Лясная быль» па аповесці М. Чарота «Свінапас» (1926 г., рэжысёр Ю. Тарыч), «Кастусь Каліноўскі» (1927 г., рэжысёр В. Гардзін). Рэвалюцыйная барацьба беларускага народа і будаўніцтва сацыялістычнага грамадства — асноўныя тэмы творчасці беларускіх кінематаграфістаў таго часу.

Сярод беларускіх жывапісцаў паспяхова вылучаюцца В. Волкаў («Малатабоец», «Партызаны», «Плытагоны»), М. Філіповіч («Бітва на Нямізе», «Ноч на Івана Купалу», «Паўстанне К. Каліноўскага»), У. Кудрэвіч (пейзажы), М. Шагал («Мір хацінам, вайна палацам»), Я. Драздовіч (афармленне часопіса «Рунь»).

Пасля паўторнага прагляду прэзентацыі настаўнік прапаноўвае вучням параўнаць уражанні ад зместу карціны М. Шагала, малюнкаў Я. Драздовіча і плаката А. Лісіцкага.

**Тэзіс 2** (прыклад). Палітыка беларусізацыі аказала станоўчыя ўмовы для развіцця культурнага жыцця краіны.

**Літаратурнае жыццё 20-х гг.** было надзвычай рознабаковым і інтэнсіўным. Беларусь зноў набыла дзяржаўнасць, працягвалася палітыка беларусізацыі. Грунтоўны падмурак для развіцця літаратуры быў закладзены ў нашаніўскі перыяд. У розных жанрах плённа працавалі тыя, хто пачынаў у гэтай газеце: Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля, М. Гарэцкі. Іх яднала думка пра лёс Бацькаўшчыны. Трывогай за будучыню Беларусі жыве лірычны герой вершаў Я. Купалы — духоўны лідар нацыі:

Я зноў заснуўшую было жалейку
Бяру і пробую ў ёй галасоў:
Ці хопіць светлых, звонкіх думак-слоў,
Ці гладка пойдзе песня-дабрадзейка?
*Я. Купала. Для Бацькаўшчыны, 1918 г.*

Я. Колас у сваёй паэзіі гэтага часу заклікаў беларусаў да актыўнага сацыяльна-грамадскага жыцця (верш «Да працы!»). Думкамі пра вольную працу на ўласнай зямлі жывуць героі яго паэтычнага эпасу «Новая зямля».

Разам з тым, 1920-я гг. характарызуюцца масавым прылівам у літаратуру маладых талентаў: К. Крапівы, К. Чорнага, М. Лынькова, П. Броўкі, М. Чарота, У. Дубоўкі, А. Мрыя і іншых. Творчай моладзі было дзе друкавацца: выходзіць часопіс «Полымя» (1922), «Маладняк» (1923), «Узвышша» (1927). Гэты літаратурны перыяд цікавы не толькі з'яўленнем новых пісьменніцкіх пакаленняў. Рэвалюцыя звязала ў адным часе прадстаўнікоў розных пакаленняў: маладых пісьменнікаў,

Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

# ЛІТАРАТУРА

1. *Гарэцкі, М.* Прысады жыцця / М. Гарэцкі. Мінск, 2003.
2. *Крот, М.* Жывыя старонкі мінулага : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў /М. Крот. Мінск, 1997.
3. *Крот, М. С.* Жывыя старонкі мінулага : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў / М. С. Крот. Мінск, 1977.
4. *Лявонава, Е.* Плыні і постаці: З гісторыі сусветная літаратуры другой паловы XIX—XX стст. : дапаможнік для настаўнікаў / Е. Лявонава. Мінск, 1998.
5. *Ляшук, В. Я.* Вывучэнне творчасці Кандрата Крапівы ў школе : дапаможнік для настаўніка / В. Я. Ляшук, М. І. Яніцкі. Мінск, 2007.

# ЗМЕСТ

Урок 1. Беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя . . . . 1
Урок 2. Жыццёвы і творчы шлях М. Гарэцкага . . . . 5
Урок 3. Вырашэнне тэмы вернасці роднай зямлі, служэння інтэлігенцыі народу ў апавяданні М. Гарэцкага «Роднае карэнне» . . . . 9
Урок 4. Гуманістычны пафас апавядання М. Гарэцкага «Літоўскі хутарок» . . . . 11
Урок 5. З. Бядуля. Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка . . . . 14
Урок 6. Апавяданне «Бондар». Вырашэнне тэмы мастака і мастацтва ў кантэксце сацыяльных праблем. Вобраз майстра-працаўніка . . . . 16
Урок 7. У. Дубоўка. Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэта. Асноўныя матывы лірыкі . . . . 18
Урок 8. Паэтызацыя красы прыроды, кахання. Сувязь лірыкі У. Дубоўкі з традыцыямі фальклору, паэзіяй Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча . . . . 21
Урокі па творчасці К. Крапівы . . . . 23
Урок 9 (1). К. Крапіва. Жыццёвы і творчы шлях байкапісца, драматурга, вучонага. Байкі «Дыпламаваны баран», «Махальнік Іваноў» . . . . 23
Урок 10 (2). Камедыя «Хто смяецца апошнім». Актуальнасць праблем, узнятых у камедыі. Канфлікт у п’есе . . . . 27
Урок 11 (3). Маштабнасць сатырычных вобразаў Гарлахвацкага і Зёлкіна. Эвалюцыя характару Тулягі 29
Урок 12 (4). Вобразы-носьбіты аўтарскай пазіцыі: Чарнавус, Левановіч, Вера. Мова персанажаў як сродак раскрыцця іх характараў. Значэнне творчасці К. Крапівы . . . . 32
Урокі 13—14. Класнае кантрольнае сачыненне па творчасці К. Крапівы . . . . 34
Урок 15. М. Зарэцкі. Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць пісьменніка . . . . 34
Урок 16. Грамадскае і асабістае ў апавяданні М. Зарэцкага «Ворагі» . . . . 36
Урок 17. Жыццёвы і творчы шлях К. Чорнага . . . . 38
Урок 18. Ідэйна-мастацкі змест апавядання К. Чорнага «Макаркавых Волька» . . . . 40
Урок 19. Беларуская літаратура ў гады Вялікай Айчыннай вайны . . . . 42
Урок 20. П. Броўка. Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць паэта. Агляд творчасці перыяду Вялікай Айчыннай вайны . . . . 44
Урок 21. Творчасць П. Броўкі канца 1940-х — пачатку 1950-х гг. Пашырэнне ідэйна-тэматычнага і жанравага дыяпазону паэзіі ў 1960—1970-я гг. . . . . 46
Урок 22. Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945—1965 гг.) . . . . 48
Урок 23. А. Куляшоў. Жыццёвы і творчы шлях паэта . . . . 50
Урок 24. Глыбіня лірычнага пачуцця ў лепшых творах даваеннага часу («Мая Бесядзь»). Ваенная лірыка А. Куляшова (балада «Над брацкай магілай») . . . . 52
Урок 25. Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай лірыцы А. Куляшова. Зварот да тэм жыцця і смерці, кахання і вернасці, лёсу і абавязку . . . . 55
Урок 26. М. Танк. Кароткія звесткі пра жыццё і творчасць. Шырокі творчы дыяпазон ранняй паэзіі М. Танка. Адметнасць лірыкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны . . . . 58
Урокі 27—28. Пашырэнне тэматыкі ў пасляваеннай паэзіі М. Танка. Увага да духоўнага свету чалавека, агульначалавечых каштоўнасцей («Каб ведалі», «Мой хлеб надзённы», «Завушніцы», «Ave Maria», «Працягласць дня і ночы») . . . . 61
Урок 29. Паэма М. Танка «Люцыян Таполя». Праблема мастака і мастацтва . . . . 63
*Дадаткі*
Дадатак 1. Тэставы кантроль «Жыццёвы і творчы шлях М. Гарэцкага» . . . . 67
Дадатак 2. Картка-апора «Гуманістычны пафас апавядання М. Гарэцкага «Літоўскі хутарок» . . . . 68
Дадатак 3. Вынік работы груп . . . . 68
*Літаратура* . . . . 71



Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

УДК 372.821.161.3.046.14
ББК 74.261.8(4Беи)я721
П19

Рэцэнзенты:
загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры БДПУ імя М. Танка, кандыдат філалагічных навук, дацэнт **І. М. Гоўзіч**;
настаўніца беларускай мовы і літаратуры ДУА «Гімназія № 42 г. Мінска», лаўрэат Нобелеўскай прэміі Ж. І. Алфёрава **А. І. Гулякевіч**

**Пасюта, А. В.**
С17 Беларуская літаратура. Планы-канспекты ўрокаў. 10 клас (І паўгоддзе) : дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / А. В. Пасюта. — Мазыр : Белы Вецер, 2016. — 71, [1] с. : іл.
ISBN 978-985-587-100-3.

Выданне адпавядае сучасным дасягненням методыкі, а таксам «Вучэбнай праграме» па беларускай літаратуры для 10 класа (базавы ўзровень). Падрыхтаваны дапаможнік уключае вывучэнне тэмы «Беларуская літаратура першай трэці ХХ стагоддзя», а таксама некалькі падтэм тэмы «Беларуская літаратура сярэдзіны ХХ стагоддзя (1940-я — сярэдзіна 1960-х гадоў)». Матэрыял пададзены ў адпаведнасці з прынцыпамі навуковасці, сістэмнасці і паслядоўнасці.

Прызначана настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**УДК 372.821.161.3.046.14**
**ББК 74.261.8(4Беи)я721**

Вытворча-практычнае выданне

**ПАСЮТА Алена Васільеўна**

**БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. ПЛАНЫ-КАНСПЕКТЫ ЎРОКАЎ**
**10 КЛАС (І ПАЎГОДДЗЕ)**

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

Адказны за выпуск *А. У. Дзянісава*

Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru